*ARKUSZ ZAWIERA INFORMACJE PRAWNIE CHRONIONE DO MOMENTU ROZPOCZĘCIA EGZAMINU!*

**Miejsce na naklejkę**

*dysleksja*

**MOB-P1_1P-092**

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

**Czas pracy 170 minut**

**MAJ ROK 2009**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 11 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

***Życzymy powodzenia!***

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **70 punktów**

*Część I – 21 pkt*
*Część II – 49 pkt*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

# CZĘŚĆ I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Сяргея Трусава *Шлях па вадзе* і адкажы на пытанні. Адказвай выключна на аснове тэксту і толькі сваімі словамі, або згодна з патрабаваннямі задання.**

**Сяргей Трусаў**

***Шлях па вадзе***
(скарочана)

**1.** Аўгустоўскі канал зближае не проста Віслу і Нёман, а і людзей — суседзяў Беларусі, Польшчы і Літвы. [...] Даўжыня канала складае 101,2 кіламетра, з іх па штучных рэчышчах — 40, па сажалках — 8, па азёрах — 18, па натуральных рэчышчах — каля 37 кіламетраў. Канал з усімі сваімі інжынернымі збудаваннямі вельмі гарманічна ўпісваецца ў навакольную прыроду, і гэта — несумненная заслуга яго стваральнікаў. Але перш чым гаварыць пра эстэтыку, успомнім гісторыю будаўніцтва канала.

**2.** Пасля разгрому напалеонскай Францыі Польшча, паводле рашэнняў Венскага кангрэса 1814/1815 гг., была падзелена паміж трымя дзяржавамі. Паўднёвая частка адышла да Аўстрыі, цэнтральная — да Расіі, паўночная — да Прусіі. Так цэнтральная частка Польшчы аказалася адрэзанай ад Балтыйскага мора.

**3.** Прусія [...] увяла ў 1822 годзе надзвычай вялікія пошліны[1] на тавары, што правозіліся па Вісле і Нёмане да партоў Балтыйскага мора. Перавозкі тавараў праз Прусію, зрабіўшыся нявыгаднымі, спыніліся. Паміж Прусіяй і Расіяй рэзка пагоршыліся стасункі, што вымусіла царскі ўрад звярнуцца да ідэі пабудовы воднага шляху Вісла — Нёман — рускі порт Віндава (цяпер Вентспілс, Латвія) у абыход прускіх партовых гарадоў Гданьск, Кёнінсберг, Эльблонг, Клайпеда. Ініцыятарам гэтай прапановы выступілі тагачасны міністр фінансаў Польшчы князь Ф. К. Друцкі-Любецкі і міністр унутраных спраў граф А. Т. Мастоўскі. План новага воднага шляху адобрыў[2] імператар Аляксандр I [...] і даручыў пашукаць вайсковага спецыяліста, здольнага распрацаваць дэтальны праект будаўніцтва, а потым і ўзначаліць яго. Выбар спыніўся на дастаткова вядомым ужо ў той час таленавітым ваенным інжынеры Ігнацыям Прандзінскім.

**4.** Падпалкоўнік Прандзінскі прыбыў у горад Аўгустоў летам 1822 года. Ушчыльную[3] заняўся падрыхтоўкай праекта воднага шляху. Ён правёў каласальныя па аб'ёмах разведвальныя работы[4], тэарэтычныя даследаванні, вырашыў мноства практычных і арганізацыйных задачаў. У канцы 1823 года Прандзінскі вярнуўся ў Варшаву для канчатковай дапрацоўкі праекта. Праект, які атрымаў назву «Аўгустоўскі канал», быў закончаны вясной 1824 года. [...] Актыўнае будаўніцтва канала пад кіраўніцтвам I. Прандзінскага працягвалася да 1825 года. Былі пракладзены штучныя рэчышчы, пабудаваны ўнікальныя шлюзы[5], масты, плаціны[6], паглыблены натуральныя вадаёмы[7], каб зрабіць іх суднаходнымі[8]. Кіравалі работамі ў асноўным ваенныя інжынеры, рабочых наймалі з мясцовых жыхароў. На будаўніцтве канала (разам з персаналам прадпрыемстваў, якія пастаўлялі матэрыялы) працавалі больш за 7000 чалавек.

---

[1]Пошліна — грашовы збор, падатак за тавары, якія ўвозяцца або вывозяцца
[2]Адобрыць — станоўча аднесціся да чаго-небудзь; згадзіцца з чым-небудзь, прыняць (праект, план)
[3]Ушчыльную — тут: адразу
[4]Разведвальныя работы — працы, мэтай якіх з'яўляецца разведанне пра што-небудзь, даведацца ці і якім спосабам нешта можна зрабіць
[5]Шлюз — гідратэхнічнае збудаванне, прызначанае для перавозу суднаў з адной воднай прасторы ў другую, з іншым узроўнем вады
[6]Плаціна — гідратэхнічнае збудаванне на рэках ці азёрах для падняцця ўзроўню вады
[7]Вадаём — натуральная або штучная ўпадзіна, напоўненая вадой
[8]Суднаходны — па якім могуць плаваць судны

**5.** У хуткім часе, аднак, у адносінах да аўтара праекта было адноўлена даўняе следства — па прычыне яго ўдзелу ў Нацыянальным патрыятычным таварыстве. Арышт і судовае разбіральніцтва[9] закончылася для Прандзінскага трохгадовым зняволеннем. Пасля вызвалення Прандзінскі аднавіў работу на канале, але быў ужо не кіраўніком, а адказным за зямельныя работы і асобныя будаўнічыя аб’екты.

**6.** У 1830 годзе Прандзінскі прымаў удзел у польскім паўстанні[10], за што быў зноў арыштаваны і адпраўлены на тры гады ў ссылку. У 1834 годзе Прандзінскі вярнуўся на радзіму, але канал ужо не будаваў: пасяліўся ў вёсцы.

**7.** Перапыненае паўстаннем будаўніцтва Аўгустоўскага канала аднавілася (пад кіраўніцтвам цывільнага інжынера Тэадора Урбанскага) у 1833-м і закончылася ў 1839 годзе. Праўда, асноўныя работы былі выкананы да 1830 года, і такія тэмпы будаўніцтва ў тыя часы лічыліся рэкорднымі.

**8.** Сёння канал праходзіць па рэках Нараў, Бебжа, Нета, далей праз азёры Сайна, Нецка, Белае, Сцюдзёнае, па рацэ Чорная Ганьча і адкрываецца ў Нёман. Другая лінія канала па рэках Нёман — Дубіса — Віндава (цяпер Вента) засталася незакончанай, паколькі ў сярэдзіне XIX стагоддзя пачаў бурна развівацца чыгуначны транспарт і патрэба ў Аўгустоўскім канале адпала. [...]

**9.** Напачатку Аўгустоўскі канал выкарыстоўваўся па сваім прамым прызначэнні — па ім перавозілі соль, муку, збожжа, мел[11], гіпс і іншыя тавары. [...] Аднак з сярэдзіны XIX стагоддзя канал пачаў паступова прыходзіць у заняпад. З 1852 года па ім сплаўлялі толькі лес, а з сярэдзіны 60-х гадоў XIX стагоддзя пра Аўгустоўскі канал амаль цалкам забыліся.

**10.** Усяго на канале было 18 шлюзаў (4 з іх цяпер знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі), мноства мастоў, плацінаў, службовых будынкаў. [...] Шлюзы Аўгустоўскага канала — гэта сапраўдныя шэдэўры[12] інжынернай думкі, пабудаваныя надзвычай старанна, дабротна[13] і надзейна. [...] Каля шлюзаў узводзіліся трывалыя (на стагоддзі) будынкі для наглядчыкаў. [...] Унікальнасць усіх гэтых збудаванняў тым больш уражвае, калі ўлічыць тагачасныя вельмі сціплыя тэхнічныя магчымасці. [...] Берагі канала ўмацоўвалі сумессю зямлі з глінай, на якой сеялі траву, [...] высаджвалі жывую агароджу з кустоў і дрэў. Дзякуючы гэтаму канал атрымаўся, калі можна гэтак сказаць, «экалагічна чыстым», ён ахінуты нейкай асаблівай цішынёй, і ў яго наваколлях заўсёды вадзілася шмат звяроў і птушак.

**11.** [...] Дзве сусветныя вайны нанеслі Аўгустоўскаму каналу велізарны ўрон.[14] Пасля другой сусветнай вайны польская частка канала была адрэстаўравана і прызначана гістарычным помнікам. Цяпер канал выкарыстоўваецца ў народнагаспадарчых[15] і турыстычных мэтах. [...] Дарэчы, польскім бокам рыхтуецца пакет дакументаў для падачы заявы ў ЮНЭСКА аб унясенні Аўгустоўскага канала і прылеглых да яго тэрыторый у Спіс сусветнай спадчыны. [...]

**12.** А вось нашы 17 кіламетраў канала — ад польска-беларускай мяжы да Нёмана — пакуль ніяк не выкарыстоўваюцца. І нікім не рэстаўруюцца. [...] Але, падобна, адчуванне закінутасці і поўнага забыцця ўсё ж падманлівае. Трэцяга верасня 2000 года ў Дамбрууцы, што поблізу Сапоцкіна, прайшла чарговая, ужо трэцяя па ліку сустрэча «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў». Гэтае штогадовае мерапрыемства прываблівае не толькі мясцовых жыхароў. На гэты раз сабраліся шматлікія госці з Беларусі, Літвы і Польшчы — усяго каля трох тысяч чалавек.

Трусаў С. *Шлях па вадзе* // Беларусь. 2001, № 3, с. 4—6, 26.

---

[9] Судовае разбіральніцтва — судовы працэс, следчыя і судовыя дзеянні, якія праводзяцца з мэтай даказаць віну або нявіннасць падазронага

[10] Польскае паўстанне — Лістападаўскае паўстанне, мэтай якога было нацыянальнае вызваленне з-пад Расійскай імперыі

[11] Мел — мяккі, белы вапняк, які ўжываецца да пабелкі, пісання і інш.

[12] Шэдэўр — узорны, выдатны твор мастацтва, майстэрства

[13] Дабротна — добраякасна, прыгожа, адпаведна з высокімі эстэтычнымі і практычнымі вымаганнямі.

[14] Урон — прынесці шкоду, страту

[15] Народнагаспадарчы — які мае адносіны з народнай гаспадаркі, выкарыстоўваецца для гаспадарчай дзейнасці раёна

# Заданні да тэксту

## Заданне 1 *(1 пункт)*

**Абазнач, якую ролю выконваюць у тэксце падрабязныя звесткі пра канал, пададзеныя ў 1-м, 8-м і 10-м абзацах:**

**а)** інфармацыйную
**б)** выхаваўчую
**в)** паэтычную

## Заданне 2 *(2 пункты)*

**На аснове 2-га абзаца напішы 2 прычыны пабудовы Аўгустоўскага канала.**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

## Заданне 3 *(1 пункт)*

**На аснове 3-га абзаца адкажы, чаму паявілася пільная патрэба ў пабудове новага воднага шляху?**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

## Заданне 4 *(2 пункты)*

**Якія пасады займаў прызначаны кіраўнік, што ён зрабіў для здзяйснення планаў пабудовы канала? Пры адказе карыстайся 3-м і 4-м абзацамі.**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

## Заданне 5 *(2 пункты)*

**На аснове 5-га і 6-га абзацаў напішы, чаму арыштавалі І. Прандзінскага?**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

## Заданне 6 *(2 пункты)*

**Падбяры сінонімы да ўжытых у 1-м, 3-м, 4-м і 11-м абзацах слоў:**

стваральнік — ..........................................................................................................

стасункі — ..........................................................................................................

каласальны — ..........................................................................................................

адрэстаўраваць — ..........................................................................................................

## Заданне 7 *(2 пункты)*

**У 10-м абзацы адшукай і выпішы 2 словазлучэнні, якія даюць ацэнку будаўнічым канала.**

..........................................................................................................

..........................................................................................................

..........................................................................................................

..........................................................................................................

## Заданне 8 *(1 пункт)*

**На аснове 8-га і 9-га абзацаў напішы: што прычынілася да заняпаду канала?**

..........................................................................................................

..........................................................................................................

..........................................................................................................

## Заданне 9 *(1 пункт)*

**Растлумач, якую функцыю ў 3-м, 4-м, 7-м, 8-м і 10-м абзацах выконваюць дадзеныя ў дужках выказванні.**

..........................................................................................................

..........................................................................................................

..........................................................................................................

## Заданне 10 *(1 пункт)*

**Чаму аўтар у 10-м абзацы называе Аўгустоўскі канал «шэдэўрам інжынернай думкі»? Напішы ўласнымі словамі.**

..........................................................................................................

..........................................................................................................

..........................................................................................................

..........................................................................................................

## Заданне 11 *(2 пункты)*

**Які падыход да аднаўлення Аўгустоўскага канала існуе ў беларускага боку (Адкажы на аснове 12-га абзаца).**

..........................................................................................................

..........................................................................................................

..........................................................................................................

## Заданне 12 *(2 пункты)*
**Запішы сваімі словамі сэнс словазлучэнняў з 5-га і 12-га абзацаў:**

Прандзінскі аднавіў работу на канале — ......................................................................

...............................................................................................................................

мерапрыемства прываблівае не толькі мясцовых жыхароў — ...........................................

...............................................................................................................................

## Заданне 13 *(2 пункты)*
**Абазнач які характар мае тэкст Сяргея Трусава?**
**а)** навуковы

**б)** публіцыстычны

**в)** мастацкі

# CZĘŚĆ II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu

**Ta część zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność tworzenia własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu. Wybierz jeden z nich i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

**Тэма 1: На аснове інтэрпрытацыі верша Віктара Шведа *Прамінанне* і тэкста Сакрата Яновіча *Гасцінец* параўнай аўтарскія рэфлексіі аб прамінанні.**

Віктар Швед

***Прамінанне***

*Памяці бацькі*

Кволае дрэўца лясное бярозкі
Калісьці прынёс шустры хлопец у вёску.
Сталася дрэўца бярозай ля тына[1],
А з шустрага хлопца — дарослы мужчына.
Гадоў прамінуў ужо сёмы дзесятак.
Бяроза красуецца кронай багатай —
З мужчыны зрабіўся слабенькі старэча.
Дрэмле ля дрэва, згорбіўшы плечы.
Пад стройнай бярозаю месца пустое —
Не стала старэчы з сівой барадою.
Сумуе па ім прыгажуня-бяроза,
Плывуць па лісточках расіначкі-слёзы.

*Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.*
Склад.: В. Сянкевіч, Я. Грыгарук. Warszawa 2001, s. 309.

[1] Тын — агароджа з вертыкальных жэрдак, пераплеценых лазой; від агароджы з цесна ўложаных дошак

Сакрат Яновіч
***Гасцінец***

Жыццё — бы той гасцінец[2], па якім праходзім вярсту за вярстою.

Губляемся паміж гоняў[3] жыцця буйнага і прыпынімся заварожанымі ля кветкі першага кахання. Спяшаемся далей, не сарваўшы яе, бо здаецца нам, што сустрэнем яшчэ прыгажэйшую. Бачым наўкола далячынь найдзівосную!

Ідзём праз жыццё штораз павальней, адзін пагорак вышэй другога, шукаем цяньку хоць бы пад дзічкаю, на мяжы палыну, і паглядзім на пяройдзеныя вёрсты, і ўгледзім, дадёкую кветку першага кахання. Але ўжо занадта далёка зайшлі мы, каб вярнуцца па яе. І засынаем ад знямогі, і сніцца яна нам не раз, а прыгажосць яе сталася меркаю прыгажосці свету і хараства.

І да скону не зразумеем, чаму пры гасцінцы жыцця нашага толькі адна такая кветка была...

*Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.*
Склад.: В. Сянкевіч, Я. Грыгарук. Warszawa 2001, s. 315.

**Тэма 2: Ахарактарызуй эмацыянальнае становішча лірычнага героя верша Рыгора Барадуліна *Трэба дома бываць часцей* (звярні ўвагу на шматзначнасць слова дом).**

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

Не забываць, як падвялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню цыбаты асвер[10]
Запускае руку да пахі.

Не забыць сцежкі той, што цябе
На дарогу выводзіла з дому,
Што ў хаце там быў рубель
У цане і па курсу старому.

Не забыць, як марозам злым
Клямка пальцы пячэ балюча
І адкуль на стале тваім
Бохан свежага хлеба пахучы.

Помніць свой на іржышчы[11] цень,
Не забыць, як завуць суседа,
Не забыць, як пяе пад дзень
За вясёлым сталом бяседа.
Помніць кожнай масніцы[12] спеў,
Кожны кут у прыціхлай хаце.
Лёсу дзякаваць, што паспеў
Ты пачуць блаславенне маці.

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою ты стаў чысцей
І не страціў святое штосьці.

Барадулін Р. *Выбраныя творы ў двух тамах.* Мінск, 1984, т. 1, с. 47.

[2]Гасцінец — тут: дарога, шлях
[3]Гоні — шырокая доўгая ніва; прастор, зямля (паэтычна)
[4]Асвер — калодзежны журавель, адпаведнае прыстасаванне да выцягання вады з калодзежа.
[5]Іржышча — астаткі сцяблоў ад зжатага збожжа на полі
[6]Масніца — тут: дошка падлогі

# CZYSTOPIS

.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................
.............................................................................................................................................

# BRUDNOPIS